# Источник: "Звязда" - 2013-06-21

Даты | Падзеі | Людзі

**Дзень летняга сонцастаяння. Пачатак лета ў Паўночным паўшар'і Зямлі і пачатак зімы — у Паўднёвым паўшар'і; самы доўгі па часе дзень і самая кароткая ноч у годзе.**

**1864** год — нарадзіўся (вёска Бялевічы, цяпер Слуцкі раён) Аляксандр Казіміравіч Сержпутоўскі, беларускі этнограф, фалькларыст. Сапраўдны член Інбелкульта (1925-1927). З 1893 года працаваў у Мінскім аддзяленні сялянскага пазямельнага банка і Мінскім паштова-тэлеграфным ведамстве, у этнаграфічным аддзяленні Рускага музея. Узначальваў падкамісію ў Камісіі па складанні этнаграфічных карт і вывучэнні нацыянальнага складу насельніцтва Расіі пры Акадэміі навук, аналагічную камісію пры Рускім геаграфічным таварыстве. Сабраў у Беларусі багаты этнаграфічны і фальклорны матэрыял. Аўтар нарыса «Беларусы-палешукі», у якім апісаны звычаі і вераванні сялян Мазыршчыны і Случчыны. Даследаваў земляробчыя прылады працы, бортніцтва, дыялекты беларускай мовы. Выдаў зборнікі «Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў», «Забабоны беларусаў-палешукоў». За зборнік беларускіх прыказак са слоўнікам быў узнагароджаны малым залатым медалём Рускага геаграфічнага таварыства. Вывучаў дыялекты беларускай мовы. Рукапісы Сержпутоўскага захоўваюцца ў Дзяржаўным музеі этнаграфіі Расійскай Федэрацыі, Рускім музеі, НАН Беларусі. Памёр у 1940 годзе.

**1957** год — у ЗША быў арыштаваны знакаміты савецкі разведчык Рудольф Абель. Яго сапраўднае імя Уільям Фішэр. Ён быў сынам нямецкага камуніста, а нарадзіўся ў Англіі. У 1920-я гады сям'я пераехала ў СССР, дзе пэўны час жыла ў Крамлі. Уільям паступіў у разведшколу НКУС, пасля чаго быў накіраваны ў Англію. Пік яго кар'еры прыйшоўся на пасляваенны час, калі Фішэр быў перакінуты ў ЗША з фальшывым пашпартам на імя Гольдфуса. Яго «дахам» была фотастудыя ў Брукліне. Ён сапраўды быў выдатным фатографам. Акрамя таго, Фішэр маляваў, іграў на фартэпіяна, ведаў шэсць моў. Нейкі час кіраваў шпіёнскай сеткай у Амерыцы, потым перабраўся ў Фінляндыю, дзе для канспірацыі ажаніўся з фінкай, хоць у Маскве яго чакала руская жонка. Вярнуўшыся ў Амерыку, Фішэр быў выдадзены перабежчыкам. Суд над ім стаў на Захадзе падзеяй нумар адзін, але савецкая прэса не прамовіла пра яго ні слова. Абелю далі 30 гадоў. Аднак ужо ў 1962 годзе на мяжы Заходняга і Усходняга Берліна на мосце Глініке «шпіёна № 1» абмянялі на збітага над СССР амерыканскага лётчыка Фрэнсіса Гэры Паўэрса (пра гэта выдатна расказана ў вядомым фільме «Мёртвы сезон»). Пасля гэтага Абель-Фішэр жыў у Маскве з першай жонкай і дачкой Эвелін, гуляў у більярд, маляваў пейзажы і пакутаваў ад незапатрабаванасці. Пасмяротна выйшаў альбом яго прац.



**1951** год — нарадзіўся (вёска Сугакі Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці) Віталь Вітальевіч Лапа, беларускі вучоны ў галіне аграхіміі, доктар сельскагаспадарчых навук (1966), прафесар (1997), член-карэспандэнт НАН Беларусі (2009). Аўтар навуковых прац па ўрадлівасці глеб і распрацоўцы спосабаў яе павышэння, уплыву ўгнаенняў на ўраджайнасць і якасць раслінаводчай прадукцыі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2003).

## Было сказана

**Максім БАГДАНОВІЧ,**
**паэт, публіцыст, перакладчык:**

*«Ўсё знікае, праходзіць, як дым,*
*Светлы ж след будзе вечна жывым».*